*Э. Р. Іофе (Мінск, БДПУ)*

# ЯКУБ КОЛАС ЯК ВУЧОНЫ-ФАЛЬКЛАРЫСТ

Адной з малавывучаных тэм з'яўляецца даследаванне навуковай спадчыны Якуба Коласа, асабліва яго прац па вывучэнню беларускага фальклора. Навуковая дзейнасць пісьменніка ў гэтым напрамку пачалася яшчэ да Кастрычніцкай рэвалюцыі, але асабліва плённа яна вялася ў савецкі час. Гэтаму спрыяла праца Я. Коласа ў літаратурнай камісіі Інстытута беларускай культуры. Паступіўшы ў 1898 годзе ў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю, Кастусь Міцкевіч збірае і запісвае вусную народную творчасць і матэрыялы па этнаграфіі. У красавіку 1907 года Я. Колас закончыў працу над 14 фальклорнымі сюжэтамі, народнымі казкамі для кнігі «Другое чытанне для беларусаў». Кніга была надрукавана асобным выданнем у 1909 годзе ў Санкт-Пецярбургу. Некаторыя творы («Баба і чорт», «Варона і зязюлька») у выданне не ўвайшлі. Асобныя творы – «Думкі ў дарозе» («У дарозе») – былі зняты царскай цэнзурай [1, с.71].

Многаму навучыўся пісьменнік у вядомага вучонага Я. Ф. Карскага, якога Канстанцін Міхайлавіч лічыў вялікім аўтарытэтам у галіне вывучэння фальклора. Інстытуту беларускай культуры праз краязнаўства ўдалося абудзіць цікавасць да збору фальклору ў настаўнікаў, студэнтаў, вучняў старэйшых класаў школ.

У час працы над паэмай «Сымон-музыка» у чэрвені-ліпені 1924 года Якуб Колас чытае карэла-фінскі народны эпас «Калевала». «Нешта падобнае да «Калевалы» можна скласці і з беларускіх казак, – піша пісьменнік, – Падабраць іх у парадак, пераложыць, магчыма, у вершы і звязаць адным героем, якім-небудзь кавалём ці што» [2, с.126 – 127].

У 1928 годзе выйшлі апрацаваныя Я. Коласам беларускія народныя казкі «Воўк-дурань», «Леў і воўк» (2-я рэдакцыя), народная казка «Два маразы» (2-я рэдакцыя). У 1929 годзе былі апублікаваны апрацаваныя народным песняром беларускія народныя казкі «Як пеўнік ратаваў курачку», «Пчала і шэршань» і «Зайчыкі» (2-я рэдакцыя).

У 1935 годзе пры Прэзідыуме АН БССР была створана самастойная Фальклорная камісія, старшынёй якой быў прызначаны Якуб Колас. Затым у 1937 годзе работа па вывучэнню фальклора і этнаграфіі аб'ядноўваецца ў сектары этнаграфіі і фальклору Інстытута гісторыі АН БССР. Тут пры непасрэдным садзеянні сапраўдных членаў Акадэміі навук БССР Я. Коласа і М. М. Нікольскага была пачата сістэматычная работа па збіранню і вывучэнню беларускага фальклору. Толькі ў 1930-я гады экспедыцыямі, асобнымі збіральнікамі і краязнаўцамі было сабрана каля 80 тысяч фальклорных тэкстаў, 2 тысячы фоназапісаў.

Як паведамлялася ў газеце «Звязда» [3], Прэзідыум АН БССР падвёў вынікі работы фальклорнай камісіі і адзначыў мерапрыемствы, накіраваныя на ажыўленне і развіццё фалькларыстычнай работы. Сярод гэтых мерапрыемстваў заслугоўвае адабрэння праведзенне конкурсу на лепшае збіранне фальклору. У ім прынялі ўдзел 183 чалавекі – рабочыя, калгаснікі, настаўнікі, студэнты, вучні старэйшых класаў. Яны даслалі 15 тысяч запісаў вуснай паэзіі дарэвалюцыйнага і сучаснага перыяду. Лепшыя ўзоры меркавалася ўключыць у зборнік «Беларускі сучасны фальклор». Праводзіліся экспедыцыі з мэтай збірання народна-паэтычных твораў.

У 1940 годзе вышаў першы том шматтомнага акадэмічнага выдання «Песні беларускага народа». У якасці старшыні Фальклорнай камісіі Я. Колас правеў вялікую арганізацыйную работу па збіранню беларускай вуснай народнай творчасці. У сваім звароце да рабочых, калгаснікаў, чырвонаармейцаў, працаўнікоў школ, студэнтаў, вучняў, селькораў, камсамольскіх

і піянерскіх аргарнізацый, удзельнікаў літаратурных гурткоў 8 сакавіка 1936 года ў газеце «Літаратура і мастацтва» Я. Колас даў разгорнутую праграму па збіранню і запісванню ўсіх відаў фальклору. Фальклорная камісія пачала ўлік тапенавітых спевакоў, казачнікаў, музыкантаў (цымбалістаў), танцораў і інш.

У 1946 годзе Якуб Колас апрацоўвае беларускія народныя казкі. 24 лютага Я. Колас закончыў апрацоўку тых казак, якія рыхтаваліся да выдання ў выдавецтве дзіцячай літаратуры ў Маскве. Шкада, што пры яго жыцці ў перакладзе на рускую мову яны не выдаваліся. «Народнай казкай Колас цікавіўся праз усё сваё жыццё. Ніхто з пісьменнікаў не мог з такім майстэрствам пераказваць нашы народныя казкі літаратурнаю моваю, як народны паэт Якуб Колас» [4, с. 97 – 98]. Асобае месца ў літаратурнай і навуковай спадчыне Я. Коласа займаюць «Казкі жыцця».

Беларускі вучоны-фалькларыст, заслужаны дзеяч навукі Беларусі А. С. Фядосік высока ацаніў уклад народнага песняра ў беларускую фалькларыстыку. Ён падкрэсліваў, што ў асобе Я. Коласа як бы зліліся, сінтэзіраваліся два таленты — пісьменніка і фалькларыста. А. С. Фядосік лічыў, што беларускую сацыяльна-бытавую казку нельга па-сапраўднаму зразумець без даследавання творчасці Я. Коласа ў гэтым напрамку.

Аналіз навуковай спадчыны Я. Коласа ў галіне вывучэння фальклору дае ўсе падставы для высновы, што ў яго асобе беларуская навука страціла таленавітага і арыгінальнага вучонага-фалькларыста.

*Літаратура*


1. Мушынскі, М. І. Якуб Колас. Летапіс жыцця і творчасці / М. І. Мушынскі. – Мінск, 1982. – С. 71.
2. Лужанін, М. Колас расказвае пра сябе / М. Лужанін. – С. 126 – 127.
3. Звязда. – 1936 г., – 27 снежня.
4. Якімовіч, А. Народны паэт / А. Якімовіч // Успаміны пра Якуба Коласа. – Мінск, 1982. – С. 97 – 98


*А. В. Катовіч (Мінск, БДУК)*

## ТЫДЗЕНЬ ЯК ТРАДЫЦЫЙНАЯ АДЗІНКА ВЫМЯРЭННЯ ЧАСУ

Добра вядома, што ў аснове фарміравання сістэмы злічэння часу ляжыць рух двух нябесных свяцілаў – Сонца і Месяца. Сонца задае рытмічны малюнак года і сутак. Праходжанне Месяцам кожнай наступнай фазы дало чалавецтву падставы для ўтварэння адзінкі вымярэння часу працягласцю ў тыдзень. Поўны цыкл нябеснага пераўтварэння паспрыяў фарміраванню такой часовай адзінкі, як месяц.

Даследаванні гісторыкаў традыцыйнай культуры паказалі, што зручнае ў карыстанні і звыклае для нашай свядомасці злічэнне часу па тыднях , якія налічваюць сем дзен, не з'яўляецца славянскім вынаходніцтвам. Гэта адкрыццё вавілонскай цывілізацыі, якое грунтавалася на пэўных астранамічных велічынях. У глыбокай старажытнасці людзі падлічвалі колькасць пройдзеных дзён зарубкамі на палачках (адсюль прымаўка: «Зарубі сабе на носе») ці вузельчыкамі на спецыяльна прыгатаваных для гэтага вяроўках. Вядомы звесткі пра тое, што калісьці лік дзён і начэй ажыццяўлялі пры дапамозе пяці пальцаў на руках. Такі тыдзень называлі «пяціднеўкай» або «малым» тыднем. Самым старажытным календаром, які з'явіўся за некалькі тысячагоддзяў да н.э., быў месяцовы каляндар, у аснову якога быў пакладзены